Надзея
ЯСМІНСКА

# МУРМУРЗІК



## КАЗКА
## пра незвычайнага коціка

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2022

Здалёк магло здавацца, што Мурмурзік проста... абмурзаўся. Іншыя насельнікі двара з яго часта смяяліся:

— Дзе ты так выпацкаўся? Мрр-хе-хе!

— Калі ты ў апошні раз мыўся? Грр-ха-ха!





І да таго ж абзывалі:

— Кот Клякса! Кот Плакса!

А ў Мурмурзіка ад крыўды дрыжалі вусы. З вачэй не цякло ні слязінкі, але толькі таму, што

**каты не ўмеюць плакаць.**



А развaжаць і марыць ішоў як найдалей, каб не трапляць нікому на вочы.

Але нават тады яму наўздагон неслася:

— Кот Клякса! Кот Плакса!